НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ, МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

УДК 821.161.3-4

БАЖОК
Ірына Аляксандраўна

# ЭСЭ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ: ЭВАЛЮЦЫЯ, СУЧАСНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

Мінск, 2018

Работа выканана ва ўстанове адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”

**Навуковы кіраўнік:** **Штэйнер Іван Фёдаравіч**, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры УА “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”

**Афіцыйныя апаненты:** **Тычына Міхаіл Аляксандравіч**, доктар філалагічных навук, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі”;
**Чарнякевіч Аксана Пятроўна**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі БДУ

**Апаніруючая арганізацыя:** **Установа адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна”**

Абарона адбудзецца 19 снежня 2018 года а $14^{00}$ на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.42.04 пры Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2, e-mail: inlinasbel@tut.by; тэл.: 284-18-85).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 15).

Аўтарэферат разасланы 16 лістапада 2018 г.

Вучоны сакратар савета Д 01.42.04
кандыдат філалагічных навук А. У. Бразгуноў

Гісторыя развіцця жанру эсэ ў беларускай літаратуры – важнае і актуальнае пытанне айчыннага літаратуразнаўства. Эсэ – жанр, які вылучаецца спецыфічным праяўленнем я-канцэпцыі аўтара праз мастацкі тэкст. Гістарычная эвалюцыя абумовіла шырокае выкарыстанне тэрміна, вынікам чаго стала аб’яднанне пад словам “эсэ” твораў іншых жанраў. Эсэ як жанр мастацкай літаратуры з’яўляецца аб’ектам вывучэння айчынных і замежных даследчыкаў (Л. Баршчэўскага, П. Васючэнкі, М. Тычыны, Т. Адорна, А. Вертыпарох, Я. Зыкавай, Н. Івановай, Г. Кісліцынай, Т. Лямзінай, В. Мураўёва, Ю. Несцярэнка, Р. Сколаса, К. Клауса, Б. Стральцова, В. Халізева, С. Шэбеліста, А. Эльяшэвіча, М. Эпштэйна і інш.). У літаратуразнаўчых працах вывучаецца параўнальна невялікая колькасць факталагічнага матэрыялу, прадстаўленага класічнымі творамі сусветнай літаратуры (“Застольныя гутаркі” Плутарха, “Вопыты” М. Мантэня) і эсэ паасобных пісьменнікаў (Я. Брыля, Т. Брэзы, В. Баркі, К. Паўстоўскага і інш.). Спецыфіка літаратуразнаўчых даследаванняў жанру эсэ заключаецца ў змене жанравага ідэнтыфікатара: са з’яўленнем “Вопытаў” М. Мантэня асноўнай прыметай эсэ лічыўся суб’ектывізм, з пачатку ХХ стагоддзя – парадаксальнасць, на сучасным этапе даследаванняў значным ідэнтыфікатарам жанру лічыцца “метафізічная праблематыка” (В. Дурава). Спецыфіка жанру эсэ ўплывае на характар даследаванняў, некаторыя з якіх вылучаюцца метафарычнасцю. Нявызначанасць тэрміна “эсэ” стала прычынай недакладнасці жанравай атрыбуцыі мастацкіх твораў.

**Актуальнасць** дысертацыі абумоўлена адсутнасцю ў айчынным літаратуразнаўстве даследавання гісторыі развіцця жанру эсэ ў беларускай літаратуры; варыятыўнасцю жанравай канцэпцыі эсэ і жанравага ідэнтыфікатара; нявывучанасцю эсэістычнай спадчыны У. Жылкі, А. Бабарэкі, Р. Барадуліна; недастатковасцю навуковага асэнсавання такіх значных у гісторыі беларускай літаратуры эсэістычных твораў, як “Адвечным шляхам” І. Абдзіраловіча, “Гэтым пераможаш” Сулімы, эсэістыкі Я. Брыля, У. Караткевіча, а таксама эсэ сучасных аўтараў. Сённяшні літаратурны працэс характарызуецца ростам папулярнасці эсэ, інтэнсіўным зваротам да адзначанага жанру сучасных пісьменнікаў. У літаратуразнаўстве існуе супярэчнасць поглядаў на эсэ як жанр, што абумоўлена недастатковай колькасцю аналізуемага факталагічнага матэрыялу. У сваю чаргу мастацкі аналіз эсэістычных твораў не можа быць праведзены без пэўных тэарэтычных высноў, звязаных з адметнасцю жанру. Неабходна комплекснае вывучэнне беларускіх эсэістычных тэкстаў, уключаных у праграмы курса па гісторыі і тэорыі літаратуры для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей.

Дадзеная дысертацыйная работа садзейнічае развіццю жаналогіі і пашырэнню ведаў ў галіне гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі.** Дысертацыйная работа выканана на кафедры беларускай літаратуры ўстановы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны” ў межах навуковай тэмы па рэалізацыі гранта Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь “Эсэ ў беларускай літаратурнай традыцыі: генезіс, эвалюцыя, паэтыка” (згодна з дагаворам з Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, № дзяржрэгістрацыі 20130400); работа выканана адпаведна заданню “Гістарыясофская і этыка-антрапалагічная праблематыка беларускай літаратуры ХХ – пачатку ХХІ стагоддзяў” (№ дзяржрэгістрацыі 20161022) падпраграмы “Беларуская мова і літаратура” дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў “Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства” за 2016 год. Асобныя аспекты работы распрацаваныя ў рамках планавага задання “Дыялектыка нацыянальнага і агульначалавечага ў беларускай і славянскіх літаратурах: праблемы ідэнтычнасці і працэсы культурна-цывілізацыйнага ўзаемадзеяння” (№ дзяржрэгістрацыі 20111168) дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011–2015 гг. “Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава”, падпраграма 4 “Беларуская мова і літаратура”; а таксама ў межах дзяржбюджэтнай тэмы ГБ 16-13 “Наватарскія тэндэнцыі ў сучаснай беларускай літаратуры” (2016 – 2020 гг.), № дзяржрэгістрацыі 20160273. Тэма дысертацыі зацверджана Саветам установы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”, пратакол № 1038 ад 05 снежня 2011 года.

**Мэта і задачы даследавання.** Мэтай дысертацыйнага даследавання з’яўляецца вызначэнне жанравых асаблівасцей, шляхоў фарміравання і спецыфікі функцыянавання беларускага эсэ ў працэсе літаратурнай эвалюцыі.

Для дасягнення мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

– вылучыць тыпалагічную мадэль жанру эсэ ў беларускай літаратуры;

– выявіць спецыфіку гістарычнага развіцця жанру эсэ ў беларускай літаратуры ХХ стагоддзя;

– ахарактарызаваць змест і мастацкую спецыфіку эсэ ў беларускай літаратуры;

– выявіць асаблівасці камунікатыўных узаемаадносін паміж аўтарам і чытачом у айчынных эсэ;

– вызначыць адметнасці ідэйна-тэматычнага дыяпазону і кампазіцыйнай арганізацыі сучаснага беларускага эсэ, асноўныя тэндэнцыі развіцця эсэ ў сучаснай беларускай літаратуры.

**Аб’ект і прадмет даследавання.** У якасці аб’екта даследавання абраны эсэ (творы, пазначаныя аўтарам тэрмінам “эсэ”; творы, якія адносяцца да эсэ, але не маюць аўтарскага ці рэдактарскага вызначэння жанру) і творы блізкія ў жанравых адносінах да эсэ (для вызначэння жанравых межаў) беларускіх пісьменнікаў ад даўніх часоў да пачатку XXI стагоддзя з мэтай максімальнага ахопу твораў розных гісторыка-культурных перыядаў.

Прадмет даследавання – жанравыя асаблівасці эсэ, гісторыя развіцця жанру, функцыянаванне жанру, камунікатыўныя ўзаемаадносіны паміж аўтарам і чытачом, праяўленне “я”-канцэпцыі аўтара, ідэйна-зместавыя і кампазіцыйныя змены эсэ.

**Метадалогія** даследавання носіць комплексны характар. Пры правядзенні даследавання выкарыстаны аналітычны, сістэмны, культурна-гістарычны, параўнальна-тыпалагічны метады, метад цэласнага аналізу тэксту літаратурнага твора. Агульнай метадалагічнай і тэарэтычнай асновай работы сталі працы айчынных літаратуразнаўцаў (П. Жаўняровіча, Г. Кісліцынай, Б. Стральцова, М. Тычыны, І. Штэйнера і інш.), а таксама прадстаўнікоў рускай і заходнееўрапейскай навукі (Я. Зыкавай, Н. Івановай, Л. Кайды, В. Халізева, А. Эльяшэвіча, М. Эпштэйна, Г. Швец і інш.).

**Навуковая навізна.** У дадзеным даследаванні ўпершыню ў айчынным літаратуразнаўстве праведзены комплексны літаратуразнаўчы аналіз беларускіх эсэ, а таксама эсэістычных твораў, жанрава блізкіх да эсэ. Упершыню даследаваны эсэ У. Жылкі, А. Бабарэкі, Р. Барадуліна, сучасных аўтараў. Удакладненне азначэння жанру эсэ і класіфікацыя яго разнавіднасцей у беларускай літаратуры зроблена на аснове даследавання мастацкіх твораў і з улікам сучасных навуковых тэарэтычных ведаў.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону.**

1. У старажытнай сусветнай і даўняй беларускай літаратурах існавалі тыпалагічна блізкія тэксты, якія ўяўлялі сабой прамое аўтарскае выказванне адносна філасофскай, сацыяльна-бытавой, рэлігійнай праблемы. Спарадычнае з’яўленне адзначаных твораў дазваляе гаварыць пра тыпалагічную мадэль, якая ў далейшым выявілася ў эсэ.

2. У беларускай літаратуры жанр эсэ афарміўся ў пачатку XX стагоддзя. Гісторыя станаўлення жанру пачалася з даўніх часоў, калі ў мастацкіх тэкстах праявіліся такія рысы, як суб’ектывізм і парадаксальнасць. Айчыннае эсэ вылучае нераўнамерны характар жанравай эвалюцыі. Найбольш плённымі для развіцця эсэ становяцца пераломныя этапы ў гісторыі краіны, падцверджаннем чаму – актывізацыя творчых пошукаў пісьменнікаў у 1920-я і 1990-я гады.

3. Беларускае эсэ мае характэрныя жанравыя рысы (парадаксальнасць, суб’ектыўнасць, маналагічнасць, рэфлексійнасць). Сутнасць айчыннага эсэ –

у асэнсаванні сусветнай і айчыннай гісторыі, менталітэту нацыі, яе самавызначэння, традыцый, літаратуры, значнасці культурна-гістарычных дзеячаў, у разважанні над філасофскімі метафізічнымі пытаннямі. Спецыфіка беларускага эсэ заключаецца ў выразным дамінаванні праблемы нацыянальнай ідэнтычнасці.

4. У жанры эсэ на працягу гісторыі яго развіцця праяўляюцца спецыфічныя камунікатыўныя ўзаемаадносіны паміж аўтарам і чытачом. Для эсэ характэрна персуазіўнасць, з дапамогай якой аўтар стварае неаспрэчную сістэму доказаў і пераконвае рэцыпіента ў правільнасці аўтарскага выказвання.

5. Функцыянаванне эсэ ў сучаснай беларускай літаратуры сцвярджае ўстойлівасць жанру ў айчынным мастацтве слова. У працэсе жанравай эвалюцыі ў эсэ адбылася трансфармацыя зместу, больш выразным стала праяўленне аўтарскага “я” ў тэксце, нязначна змянілася форма жанру.

**Асабісты ўклад саіскальніка**. Дысертацыйная работа і артыкулы з’яўляюцца самастойным навуковым даследаваннем аўтара.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Змест дысертацыі абмяркоўваўся 07. 03. 2018 г. на паседжанні навуковага семінара кафедры беларускай літаратуры Установы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”. Асноўныя палажэнні і вынікі даследаванняў выкладзены ў дакладах і выступленнях на навуковых мерапрыемствах: кангрэсах: “Міжнародны кангрэс даследчыкаў Беларусі” (11 – 13 кастрычніка 2013 г., Коўна, Літва), “Першы міжнародны навуковы кангрэс беларускай культуры” (5 – 6 мая 2016, Мінск, Беларусь); міжнародных канферэнцыях: “Уладзімір Караткевіч – глабальны погляд” (25 – 26 лістапада 2011 г., Орша, Беларусь); “Христианский гуманизм и его традиции в славянской культуре” (2011, 2017, Гомель, Беларусь); “Что движет солнца и светила: поэтика любви в художественной литературе” (20 – 21 верасня 2012 г., Бярдзянск, Украіна), “Мова – література – культура в контексті національних взаємозв’язків” (23 – 24 мая 2013 г., Бярдзянск, Украіна); “Современное образование: преемственность и непрерывность образовательной системы «школа – вуз»” (12 – 13 мая 2011 г., Гомель, Беларусь); “Мова і культура” (25 – 27 чэрвеня 2015 г., Кіеў, Украіна); “Скарына і наш час” (20 кастрычніка 2017 г., Гомель, Беларусь); рэспубліканскіх канферэнцыях: “Сохранение национальной идентичности белорусского общества: прошлое, настоящее, перспективы” (21 красавіка 2016 г., Баранавічы, Беларусь); “Тенденции и перспективы развития науки и образования в условиях глобализации” (28 июня 2017 г., Пераяслаў-Хмяльніцкі, Украіна); “Актуальные вопросы научно-методической и учебно-организационной работы: практико-ориентированная и фундаментальная подготовка на первой и второй

ступенях высшего образования” (15 – 16 марта 2018 г., Гомель, Беларусь); міжнародных навуковых чытаннях: “Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах: міжнародныя навуковыя чытанні, прысвечаныя памяці І. Навуменкі (7 – 8 кастрычніка 2010 г., 4 – 5 кастрычніка 2012 г., 6 – 7 кастрычніка 2016 г., Гомель, Беларусь); рэспубліканскім круглым стале: “Адлюстраванне сучаснай Беларусі ў мастацкай літаратуры” (21 чэрвеня 2018 г., Мінск, Беларусь).

Пра апрабацыю вынікаў сведчыць Акт укаранення вынікаў даследавання ў адукацыйны працэс установы адукацыі “ГДУ імя Ф. Скарыны” ад 16. 04. 2013 г., стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За распрацоўку методыкі вызначэння жанру, фарміраванне гісторыка-літаратурнай канцэпцыі эсэ і ўкараненне атрыманых вынікаў у адукацыйны працэс установы адукацыі «ГДУ імя Ф. Скарыны»” (2014 г.). Матэрыялы даследавання знайшлі практычнае прымяненне ў курсах “Тэорыя літаратуры”, “Гісторыя беларускай літаратуры”, “Уводзіны ў літаратуразнаўства”, “Сучасная літаратура Беларусі”, якія чытаюцца для студэнтаў вну спецыяльнасці “Беларуская філалогія”.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Вынікі дысертацыйнага даследавання прадстаўлены ў 22 публікацыях, сярод якіх 9 артыкулаў у навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК (2,1 аўт. арк.), 8 артыкулаў у навуковых зборніках і часопісах (2,7 аўт. арк.), 5 матэрыялаў навуковых канферэнцый (0,7 аўт. арк.). Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў складае 5,5 аўт. арк.

**Структура і аб’ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох раздзелаў, заключэння і бібліяграфічнага спісу (184 пазіцыі), які ўключае спіс выкарыстаных крыніц (162 пазіцыі) і спіс публікацый саіскальніка (22 пазіцыі). Агульны аб’ём дысертацыі складае 127 старонак, у тым ліку асноўны тэкст – 113 старонак, бібліяграфічны спіс – 14 старонак.

## АСНОЎНАЯ ЧАСТКА

Раздзел 1 **“Праблемы дэфініцыі жанру эсэ”** прысвечаны тэарэтычным і гістарычным аспектам вызначэння спецыфікі жанру эсэ. На аснове тэарэтычных прац паказваюцца разыходжанні ў вызначэнні жанравых адметнасцей.

У падраздзеле 1.1 **“Эсэ ў родава-жанравай сістэме”** падаецца азначэнне эсэ, складзенае з улікам сучасных навуковых даследаванняў і ўдакладненае ў сувязі са спецыфікай функцыянавання эсэ ў беларускай

літаратуры. Эсэ – ўстойлівы тып мастацкай формы, які характарызуецца пастаяннымі прыметамі (парадаксальнасцю, суб’ектыўнасцю, эмацыянальнасцю, рэфлексійнасцю, адсутнасцю дыдактызму, маналагічнасцю аўтарскай канцэпцыі), большасць эсэ мае ўласную структуру (парадокс, або філасафему; прыклады-доказы; паўтарэнне пачатку), а аўтар тэксту выкарыстоўвае простую мову, набліжаную да размоўнай, з сінтаксічным паралелізмам, рытарычнымі пытаннямі і інш. Ступень праяўлення адзначаных прымет вар’іруецца ў залежнасці ад віда эсэ. У падраздзеле прыводзяцца розныя погляды даследчыкаў на месца эсэ ў сістэме жанраў, даказваецца аднесенасць эсэ да “пазародавага” (тэрмін В. Халізева) жанру. У сістэме літаратурных жанраў эсэ вылучаецца асаблівым праяўленнем аўтаркага “я” ў мастацкім тэксце.

У падраздзеле акцэнтуецца ўвага на выключным значэнні вобраза аўтара, асэнсоўваецца выкарыстанне аўтарамі эсэ стратэгіі ўнушэння, а персуазіўнасць вызначаецца як характэрная адзнака разглядаемага жанру. Адзначаецца, што нягледзячы на палярнасць меркаванняў наконт структуры жанру, эсэ з’яўляецца лагічным, прадуманым, лаканічным тэкстам. Моцнымі ў эсэ з’яўляюцца асацыятыўныя сувязі.

У падраздзеле 1.2 вызначаецца **“Тыпалагічная мадэль жанру эсэ”**.

У параграфе 1.2.1 **“Тыпалагічная мадэль жанру эсэ ў сусветнай літаратуры”** разглядаюцца падобныя прыметы тэкстаў старажытнай літаратуры, якія ў далейшым паўтараліся і выявіліся ў эсэ. Тыпалагічная мадэль жанру эсэ ў сусветнай літаратуры была сфарміравана ў творчасці М. Мантэня, хаця фармальныя рысы жанру існавалі і да яго. У XVI стагоддзі гэта былі кампілятыўныя творы, раней – біблейская Кніга Экклезіяста і кнігі Платона, Плутарха, алюзіі да якіх мы знаходзім ў “Вопытах”.

У параграфе 1.2.2 **“Праблема аўтарскага самавыяўлення і фарміраванне тыпалагічнай мадэлі жанру эсэ ў беларускай літаратуры XI – XIX стагоддзяў”** вызначаецца ступень пряўлення аўтарскага “я” ў айчынных творах адзначанага перыяду, паказваецца адрозненне тыпалагічнай мадэлі жанру эсэ, якая была сфарміравана ў беларускай літаратуры, ад падобнай у сусветнай літаратуры. Падкрэсліваецца значнасць праблемы самавыяўлення асобы ў тэксце для старажытнай беларускай літаратуры. Вызначаецца ўплыў уніяцтва і пратэстантызму ў Беларусі на ступень праяўлення аўтарскага “я” ў тэкстах. Найбольш выразна тыпалагічныя рысы, якія ў далейшым сталі характэрнымі жанру эсэ, праявіліся ў творах публіцыстычнай літаратуры эпохі Адраджэння і палемічнай літаратуры эпохі Барока. У раздзеле даследуюцца паасобныя творы К. Тураўскага, Г. Цамблака, Ф. Скарыны, С. Буднага, Л. Зізанія, А. Волана, К. Транквіліёна-Стаўравецкага, у якіх у рознай ступені праявілася

сукупнасць прымет, якая паўтаралася ў творах беларускай літаратуры XX – пачатку XXI стагоддзяў і стала характэрнай для жанру эсэ.

У падраздзеле сцвярджаецца адносная самастойнасць фарміравання тыпалагічнай мадэлі жанру эсэ ў Беларусі. Сярод фактараў, якія стрымлівалі развіццё эсэізацыі, называюцца наступныя: імкненне пісьменнікаў да акрэсленых канонаў існуючых жанраў, паўсюдная хрысціянізацыя, адсутнасць перакладаў “Вопытаў” М. Мантэня, паўднёвы літаратурны ўплыў.

Скіраванасць пісьменнікаў XIX стагоддзя на даследаваннекультуры, гісторыі, этнаграфіі краіны абумовіла дамінаванне блізкага да эсэ жанру нарыса ў творчасці Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, Ф. Багушэвіча, К. Каганца і інш.

У раздзеле 2 **“Гісторыя развіцця беларускай эсэістыкі XX стагоддзя”** вызначаецца спецыфіка функцыянавання жанру эсэ ў працэсе літаратурнай эвалюцыі, даследуюцца асаблівасці значных эсэістычных твораў, вызначаецца іх роля ў станаўленні жанру.

Падраздзел 2.1 **“Адметнасці першых беларускіх эсэ і іх роля ў станаўленні жанру”** прысвечаны эсэістыцы пачатку XX стагоддзя.

Станаўленне і развіццё эсэістыкі ў Беларусі пачалося ў пачатку XX стагоддзя, у час нацыянальнага адраджэння. Тэндэнцыя да культурнага абнаўлення гэтага перыяду характэрна для многіх краін. Узнікненню першага беларускага эсэ садзейнічалі публіцыстычныя творы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, Цёткі і інш., для якіх была характэрная грамадзянская, філасофская і літаратуразнаўчая тэматыка, а стылю ўласцівыя эмацыянальнасць і рытарычнасць.

Філасофскае эсэ “Адвечным шляхам” (1921 г.) І. Абдзіраловіча (І. Канчэўскага) з’яўляецца першым беларускім творам, напісаным у жанры эсэ. Названы тэкст вялікі па памерах і спалучае ў сабе адзнакі тэарэтычнага, спрэчнага, апавядальнага, тлумачальнага, апісальнага, інфарматыўнага і крытычнага эсэ. Падзагаловак “Даследзіны беларускага светагляду” вызначае кірунак інтэлектуальнага асэнсавання праблемы, г. зн. беларускай індэнтычнасці і менталітэту. Аднак І. Абдзіраловіч пашырае гэтыя паняцці, ствараючы тым самым панарамную карціну свету, важным складнікам якой, на думку пісьменніка, з’яўляецца творчасць. Акрамя сэнсавага складніка падзагаловак утрымлівае і спасылку на жанр. Кожная структурная частка (раздзел) эсэ мае на пачатку ключавыя тэзісы. Праблемна-тэматычнае поле твора даволі шырокае і адносіцца да гісторыка-культурнай сферы. Узаемаадносіны “аўтар – чытач” у эсэ рэалізуюцца праз сэнсавыя формулы. І. Абдзіраловіч выкарыстоўвае факты, якія патэнцыяльна патрабуюць адказу ад умоўнага чытача. Адметнасцю эсэ “Адвечным шляхам” з’яўляецца ўвядзенне ў апавяданне дадатковага персанажа.

Эсэ Сулімы “Гэтым пераможаш!..” – філасофскі твор, тэарэтычнай асновай якога з’яўляюцца ідэі Фіхтэ з яго “філасофіяй свабоды”, біблейская мудрасць, тэорыя Духа па Гегелю, развагі Канта пра “абсалютнае зло”, схема “злачынства – пакаранне” Ф. Дастаеўскага і інш. Своеасабліва рэалізуецца ў эсэ вобраз “я”. Апавяданне вядзецца ад трэцяй асобы, а адметнае эсэістычнае, прыватнае, асабістае “я” ў творы Сулімы лакалізуецца непасрэдна ў філасофіі аўтара праз філасофію Фіхтэ як аўтарскага ідэалу.

Рэдкай з’явай для нацыянальнага мастацтва слова з’яўляецца метафізічная літаратура (літаратура асэнсавання, разважання, удумлівасці, максімальна пазбаўленая пачуццёвай экспрэсіі і эмацыянальнасці). Высокім інтэлектуалізмам вылучаецца творчасць А. Бабарэкі. Уласныя ідэі аўтар выказвае з дапамогай складаных высноў, тэзісаў, лагічных ланцужкоў, матэматычных формул, парадыгм, пералічэнняў і да т. п. У філасофскім эсэ “Разважанні N-скага” (1926 г. ) А. Бабарэка асэнсоўвае праблемы быцця. Так, матэрыяльны, духоўны і фармальны пачаткі прадстаўленыя як узаемазалежныя, яны роўныя, але не вечныя: пры знікненні адной формы жыцця іншыя нараджаюць яе. Такі працэс пастаянны і бясконцы. Філасофскае эсэ А. Бабарэкі “Разважанні N-скага” – адна з першых спроб рэалізацыі магчымасцей дадзенага жанру ў беларускай літаратуры. Структура твора вытрымана не зусім лагічна, адсутнічае і адна цэнтральная ідэя, на якую павінен працаваць увесь аргументацыйна-доказны матэрыял. Падобная раскіданасць думак перашкаджае дасягненню асноўнай мэты жанру. Аднак, нягледзячы на названыя недахопы, эсэ А. Бабарэкі моцнае па змесце, інтэлектуальнае, навуковае і актуальнае. У форме ліста паэта да сябра напісана філасофскае эсэ А. Бабарэкі “Да «Аб людзях і іх інтар[эсах]»”. Твор раскрывае праблему чалавека і рэчаў. Аўтар выступае гуманістам, гаворыць пра неабходнасць увагі да чалавека як асобы, указвае на недахопы ў разуменні сучасным грамадствам гуманізму. Эсэістычнымі з’яўляюцца творы А. Бабарэкі “[Аб адпаведнасьці зьяў іх значэньню]”, “[Аб “добрай волі” і “канечнасьці” ў об’ектыўным сьвеце]”, “Грыбы і мысьлі. З лесу”.

Функцыянаванне эсэ ў беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя звязана з персаналізацыяй мастацкай творчасці. У. Жылка быў адным з лідараў тагачаснай пісьменніцкай кагорты, чыя творчасць акрэсліла асноўныя дамінанты нацыянальнай літаратуры. Эсэ У. Жылкі заснаваныя на парадоксе, у іх гарманічна спалучаюцца аўтарскія аргументы і асацыяцыі. Выразна жанравыя рысы праявіліся ў эсэ “Хараство” і “Крывія”.

У падраздзеле 2.2 **“Асаблівасці эсэістычных твораў другой паловы ХХ стагоддзя”** асэнсоўваюцца эсэістычныя творы пасляваеннага перыяду, выяўляюцца адрозненні ў выкарыстанні характэрных мастацкіх рыс у эсэ розных аўтараў, характарызуюцца адметнасці эсэістыкі канца ХХ стагоддзя.

У беларускай літаратуры і літаратуразнаўстве адзначанага перыяду тэрмін “эсэ” выкарыстоўваецца часта, але творы да названага жанру не адносяцца. У беларускай пасляваеннай публіцыстыцы была распаўсюджана ідэя пра тое, што мастацтва і літаратура павінны быць дзейсным сродкам выкрыцця праўды вайны, а не сродкам самавыражэння.

Нешматлікая беларуская пасляваенная эсэістыка характарызуецца лірызмам, які разбурае межы жанру, ператвараючы эсэ ў эсэістычны нарыс.

Станаўленне аднаго з самых значных эсэістаў савецкага перыяду Я. Брыля адбывалася заканамерна і паступова. Гэтаму садзейнічаў лірычны пачатак апавяданняў, раманаў і нарысаў пісьменніка. Пераклікаецца з жанрам эсэ і жанр дарожных нататак, да якіх Я. Брыль звярнуўся ў 1950-х – 1960-х гадах. Аўтар не імкнуўся да поўнага раскрыцця праблемы, а прапаноўваў уласны пункт погляду, суб’ектыўны і часам не абгрунтаваны. У пералічаных вышэй творах моцна гучыць аўтарскае “я”, праз прызму якога аб’ект даследавання падаецца аднабакова. Істотнымі для станаўлення гісторыі і паэтыкі беларускага эсэ з’яўляюцца дзіцячыя эсэ Я. Брыля “Слова пра дружбу ...з кнігай” (1954 г.), “Слова пра дружбу ...з прыродай” (1955 г.), “Слова пра дружбу ...з працай” (1959 г.). Гэта своеасаблівы цыкл эсэ пра і для дзяцей. Яскравай адметнасцю класічнага эсэ з’яўляецца наяўнасць у ім парадокса, аўтарскага тэзіса, які супрацьстаіць агульнапрынятым канонам грамадскай думкі. У эсэ Я. Брыля ролю парадокса адыгрывае філасафема. Скразная рыса творчай манеры аўтара – лірызм, наяўнасць шматлікіх адступленняў, філасофскіх разважанняў. Адсутнасць усталяваных норм і законаў жанру эсэ ў савецкім літаратуразнаўстве дае магчымасць аўтарам (і Я. Брылю ў тым ліку) у вялікай колькасці цытаваць іншыя творы. Прычым творы менавіта мастацкія. Рэдка эсэіст дазваляе сабе выкарыстаць у якасці цытаты словы крытыка ці іншага пісьменніка. Падобная цытацыя магчымая толькі ў тым выпадку, калі яна звязана непасрэдна з паказам унікальнасці асобы або творчай манеры аўтара цытуемага твора, а сам аўтар з’яўляецца аб’ектам увагі эсэіста. Такая стратэгія ўказвае на маналагічны характар эсэ. Гэта жанр, які не вытрымлівае канкурэнцыі некалькіх канцэпцый. Светапоглядная сістэма Я. Брыля-эсэіста грунтуецца на ўзаемадзеянні ўласных філасофскіх развагі жыццёвай практыкі. Эсэістычнымі з’яўляюцца творы Я. Брыля“Алесь Адамовіч” (1978 г.) і “Наш Караткевіч” (1985 г.).

Размытасць жанравых межаў у эсэістыцы другой паловы ХХ стагоддзя дае падставы гаварыць пра жанравую бінарнасць эсэ. У творчасці аднаго пісьменніка маюць месца розныя віды эсэ, што шырока дэманструе эсэістыка У. Караткевіча. У эсэістычнай спадчыне пісьменніка ў залежнасці ад тэматыкі можна вылучыць некалькі відаў эсэ: белетрыстычнае (мастацкае, літаратурнае), біяграфічнае (і яго разнавіднасці: біяграфічна-крытычнае,

біяграфічна-мастацкае), публіцыстычнае і гістарычнае. Гарманічнасць эсэ У. Караткевіча вызваліла гэты жанр ад непатрэбнага дыдактызму, таму яго эсэ адметныя знешняй паэтычнай лёгкасцю і ўнутранай філасафічнасцю, інтэлектуалізмам. Часта мастацкае эсэ вызначаецца парадаксальнасцю. Напрыклад, філасофскае эсэ У. Караткевіча “Твой зорны шлях” цалкам пабудавана на парадоксе “зорнай гадзіны” жыцця чалавека. Функцыянаванне эсэ ў творчасці пісьменніка пацвярджаюць творы “Памяць зямлі беларускай” (1982 г.), “Песня з паўночных Афін” (1965 г.), “Saxifraga” (1971 г.), “Подзвіг Францыска Скарыны” (1980 г.), “І будуць людзі на зямлі” (1964 г.), “Сцюдзёная вясна, або 1000 год і 17 дзён” (1980 г.), “Дыяментавы горад” (1982 г.).

У 1970 – 1980-х гадах у беларускай літаратуры ўсё часцей з’яўляюцца тэксты, пазначаныя тэрмінам “эсэ”, аднак многія аўтары выкарыстоўваюць жанр як эксперыментальны, як сродак пошуку новых форм. Няпэўнае вызначэнне жанру характэрна для асобных твораў Р. Семашкевіча, Н. Гілевіча, А. Карпюка, А. Асташонка. Адметнае месца займаюць раманы-эсэ А. Лойкі “Як агонь, як вада” (1984 г.), “Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае” (1989 г.).

Да канца XX стагоддзя жанр эсэ застаецца тэарэтычна і практычна неакрэсленым. Асобныя адзінкі жанру не заўважаюцца айчыннымі літаратуразнаўцамі. Увогуле, жанравае вызначэнне не з’яўляецца прынцыповым пры складанні мастацкіх зборнікаў. У выніку эсэ губляюцца ў сферы літаратуразнаўчых даследаванняў, застаючыся ў зборах празаічных запісаў пісьменнікаў. Аналагічная сітуацыя адбылася з творчай спадчынай Р. Барадуліна, за паэтычнымі творамі якога малазаўважнай аказалася эсэістыка. Эсэ Р. Барадуліна “Існасць” (1995 г.) – адно з найбольш дасканалых у мастацкіх адносінах. У эсэ “Жыццё ці паэзія” (2000 г.) Р. Барадулін спрабуе пераканаць чытача, што паэзія і жыццё – адзінае цэлае. Пры доказе сваёй ідэі аўтар выкарыстоўвае словы з Евангелля, прыводзіць прыклады з жыцця, разважае аб прычынах фізічнай слепаты ў антычных лірнікаў, дае азначэнні “паэта” і “паэзіі” з індыйскай, грэчаскай, лацінскай моў. Пісьменнік прыводзіць неаспрэчныя доказы, якія абвяргаюць звыклыя ўяўленні аб навакольным свеце і жыцці.

Раздзел 3 **“Тэндэнцыі развіцця жанру эсэ ў сучаснай беларускай літаратуры”** прысвечаны выяўленню асаблівасцей функцыянавання і асноўных тэндэнцый развіцця эсэ ў сучаснай беларускай літаратуры.

Сёння тэрмін “эсэ” лічыцца модным і выкарыстоўваецца для актыўнай папулярызацыі мастацкіх і літаратуразнаўчых твораў. Многія пісьменнікі працягваюць падпісваць тэксты тэрмінам “эсэ”. Л. Левановіч свой твор “Стогнуць чырвоныя дрэвы” (2008 г.) у аўтарскім блогу пазначыў як “эсэ”,

хаця гэта біяграфічны нарыс, успаміны. Аналагічная жанравая нявызначанасць характэрная твору Я. Сіпакова “Мая бібліятэка” (2010 г.). Эсэ – жанр, у якім думка пісьменніка пераважна скіравана на доказ адной ідэі, аўтарскай праўды. Для “Майго мая” У. Ліпскага і “Маёй бібліятэкі” Я. Сіпакова характэрна мазаічнасць, драбленне тэксту на мноства думак, якія аб’ядноўваюцца ў адну тэму. Тэрмінам “эсэ” абазначыў свой твор “Загадка Вінцэнта” (2009 г.) У. Сіўчыкаў. Назва адсылае да “Загадкі Багдановіча” М. Стральцова. Аднак абодва творы мала падобныя да эсэ.

Сучасная эсэістыка прадстаўлена разнастайнымі відамі і формамі жанру. Сучасныя аўтары, адмаўляючы жанравыя класіфікацыі і тэарэтычныя даследаванні, спецыяльна апісваюць тое, што яны ствараюць, выразамі тыпу “проста запіс думак”.

Метафізічная эсэістыка выразна праявілася ў творчасці А. Разанава. Медытатыўнасць, лаканічнасць, рэфлексійнасць, маналагічнасць і парадаксальнасць характэрныя найперш для вершаказаў і зномаў пісьменніка.

Сярод шматлікіх біяграфічных твораў Ф. Сіўко, пазначаных аўтарам у зборніку “Выспы” (2011 г.) як “эсэ”, жанравай традыцыі адпавядаюць “Выспа смерць”, “Сволач паводле Брэма” і “Хата”. “Выспа смерць” – гэта філасофскія развагі аўтара над адвечным пытаннем жыцця і смерці. Ф. Сіўко звяртаецца да гісторыі сваёй сям’і, распавядае пра стаўленне продкаў да смерці, пра існаванне культуры смерці, якая нашмат мацней, чым уяўляецца. Пра актыўнае функцыянаванне і пераемнасць нацыянальных традыцый жанру сведчыць кніга А. Пашкевіча “Сімъ побѣдиши” (2012 г.), якая мае ідэнтычную назву з эсэ Сулімы.

У мастацкай творчасці А. Сямёнавай вядучай з’яўляецца рэлігійная тэматыка. У кнізе “Таямніцы пакутны колер” (2004 г.) пісьменніца асэнсоўвае адвечныя тэмы жыцця і смерці, віны і пакаяння, пакутаў і збавення. Сярод найноўшых прыкладаў жанру можна назваць “Каляндар Бахарэвіча” (2014 г.), які складаецца з 366 эсэ на кожны дзень года пра падзеі, асобы і факты гісторыі.

У раздзеле 3 прасочваецца творчая пераемнасць сучасных эсэістаў і пісьменнікаў пачатку ХХ стагоддзя. Звяртаецца ўвага на творчасць В. Акудовіча, аўтара кніг “Мяне няма: роздумы на руінах чалавека” (1998 г.), “Разбурыць Парыж” (2004 г.), “Код адсутнасці. Асновы беларускай ментальнасці” (2007 г.) і інш. Назва першай кнігі супрацьпастаўленая сутнасці жанру эсэ, які ўзнік у эпоху чалавекацэнтрызму і сцвярджаў пануючую ролю “я”. У другой кнізе В. Акудовіч выкарыстаў ідэю І. Абдзіраловіча адносна ідэі Беларусі як “ліючайся” формы/субстанцыі. Падзагаловак “Асновы беларускай ментальнасці” ў “Кодзе адсутнасці”

сэнсава амаль цалкам паўтарае падзагаловак "Даследзіны беларускага светагляду" ў "Адвечным шляху".

У творчасці У. Арлова прадстаўленыя белетрызаваныя эсэ, у якіх факты і загадкі гісторыі займаюць адно з цэнтральных месц у творах. Талент У. Арлова праявіўся ў многіх жанрах: нататках, апавяданнях, навелах, вершах і г.д. Аднак амаль усе яго творы эсэістычныя, адметнай формай у творчасці пісьменніка з'яўляюцца эсэ ў вершах.

І. Бабкоў у кнізе "Каралеўства Беларусь. Вытлумачэнні ру[і]наў" (2005 г.) асвятляе розныя аспекты "беларускасці". Аўтар выкарыстоўвае такія формы аповяду, як дыялогі, цытаты, дзяленні на часткі з назвамі і г.д. Эсэ І. Бабкова маюць інфарматыўна-аналітычны характар. У кнізе выражана "я"-канцэпцыя пісьменніка, найперш у творы "Аўтар і я". У "Каралеўстве Беларусь" захоўваюцца адметнасці разглядаемага жанру. Разам з тым, суб'ектыўнае не навязваецца патэнцыяльнаму чытачу, большасць твораў напісана ад трэцяй асобы, а форма выкладу не адпавядае звыклай эсэістычнай манеры.

У "Эсэ пра беларусаў" (2008 г.) пісьменніка А. Бацюкова працягваецца распрацоўка вядучай тэмы беларускага эсэ – самавызначэння нацыі. На пытальна-адказавай форме заснавана эсэ П. Васючэнкі "Беларус вачыма беларуса" (2004 г.).

У сённяшнім літаратуразнаўстве вылучаецца мноства разнавіднасцей эсэ: літаратурна-крытычнае, белетрыстычнае, гістарычнае, філасофскае, рэлігійнае, псіхалагічнае, культуралагічнае, публіцыстычнае.

Акрамя мастацкай эсэістыкі ў апошнія дзесяцігоддзі становяцца распаўсюджанымі літаратуразнаўчыя і біяграфічныя эсэ (А. Андрэева "Вы ўсё ж такі хацелі б стаць пісьменнікам?", Л. Галубовіча "Сыс і кулуары", І. Саверчанкі "Бляск кароны" (эсэ з кнігі), А. Марціновіча ("Сполахі далёкіх зарніц"), Г. Марчука (цыкл эсэ пра драматургаў), І. Шаўляковай "Сапраўдныя хронікі поўні", І. Штэйнера "Каму без чалавека патрэбна слова" і інш.).

Літаратурна-крытычныя эсэ Л. Галубовіча "Сыс і кулуары" (2010 г.) ўяўляюць цікавасць не толькі як творы інфарматыўнага, крытыка-тэарэтычнага характару, але і як творы высокай мастацкай вартасці.

У гістарычных эсэ В. Казько аб'ектам выступае абагулены вобраз чалавека-грамадзяніна. Акрамя гістарычных рэалій, тэматыку эсэістыкі складаюць развагі аб міфалагічнай культуры і сучасным мастацтве. Аб'ектам усёй гістарычнай эсэістыкі В. Казько з'яўляецца чалавек на фоне часу. На гуманістычны характар твораў указваюць шматлікія развагі пра асобу ("эсэ ў эсэ"), яе прыроду, паводзіны.

Л. Рублеўская спалучыла ў цыкле эсэ "Шыпшына для пані" (2007 г.) філасофска-парадаксальны тып мыслення і інфарматыўнасць. Эсэістыка

пісьменніцы – прыклад унікальных тэкстаў, якія, без намёку на дыдактычнасць, раскрываюць комплекс духоўна-эстэтычных каштоўнасцей. Адметнасць філасофскага асэнсавання рэчаіснасці пісьменніцай заключаецца ў пазнні свету праз прадметы, факты і пачуцці. У інфарматыўных эсэ Л. Рублеўскай своеасабліва выражаны суб’ектывізм. Шэраг аб’ектыўных рэальных фактаў утварае цэласную карціну, выбар інфармацыі, паслядоўнасць выкладу і рэдкія, але трапныя сентэнцыі дапамагаюць выказаць схаваныя адносіны аўтара да разглядаемага аб’екта. Падобны прынцып данясення ўласнай ідэі складаны, але лагічна прадуманы, таму не заўважны для непадрыхтаванага рэцыпіента.

Мэтанакіраваны зварот да эсэ як жанру з вялікімі магчымасцямі ў дасягненні аўтарскай мэты характэрны для рускамоўнай літаратуры Беларусі апошніх дзесяцігоддзяў. Прыкладам жанру ў сучаснай літаратуры варта назваць філасофскае эсэ А. Андрэева “Вы ўсё ж такі хацелі б стаць пісьменнікам?” (2016 г.). Эсэ з’яўляецца літаратурнай самарэфлексіяй.

Адной са значных тэндэнцый у развіцці сучаснай беларускай эсэістыкі з’яўляецца зварот да тэмы кахання.

У 1990-х гадах у кантэксце “шызалітаратуры” былі створаны эсэ І. Сідарука “Вольнаму – воля?”, Ю. Гумянюка “Твар Тутанхамона”. У літаратуразнаўчых працах, напісаных альтэрнатыўнымі творцамі, яскрава праяўляецца я-канцэпцыя. Ю. Барысевіч у кнізе “Цела і тэкст” (1998 г.) тэарэтычныя асновы дапаўняе ўласнымі філасофскімі развагамі. Эсэ выкарыстоўваецца ў розных літаратурна-мастацкіх колах. У 2005 годзе ў часопісе “Дзеяслоў” выходзіць эсэ Ю. Пацюпы “Laterna magica” (1996 г.). У перакладзе з лацінскай мовы назва гучыць як “Чороўны ліхтар”. У цэнтры ўвагі аўтара – феномен кахання. Эсэ з’яўляецца ўзорным творам для літаратурнай традыцыі 1990-х, напісанае яно ў стылі так званай “шызалітаратуры”. Літаратура 1990-х гадоў характарызуецца сінтэтычнасцю, таму заканамерным у эсэістыцы з’яўляецца зварот да навуковых дадзеных, азначэнняў. Тут аналітычнасць гарманізуе з хаатычнасцю, а лагічнасць трансфармуецца ў парадаксальнасць. Таму канцоўка эсэ нібы кінутая ў прастору пазнання і думак.

Побач з эксперыментальнымі эсэ ў апошняе дзесяцігоддзе ХХ стагоддзя з’яўляліся і традыцыйныя апавядальныя прыклады жанру: эга-эсэ Л. Дранько-Майсюка “Стомленасць Парыжам” (1995 г.) (хаця аўтар і сам вызначыў жанр, трэба адзначыць, што ў тэксце ёсць рысы апавядання і дзённіка), эсэ С. Дубаўца “Мой анёл паляцеў на неба” (2011 г.).

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

## Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Тыпалагічная мадэль, якая была сфарміравана ў еўрапейскай літаратуры і ў далейшым стала асновай жанру эсэ, уяўляе сабой сукупнасць наступных характарыстык: разважлівы тып мыслення, імкненне да аўтарскага самавыяўлення, адкрытасць аўтара перад умоўным чытачом, выкарыстанне прыёмаў актывізацыі ўвагі чытача, сцвярджэнне аўтарскай ісціны, суб'ектыўнасць, доказнасць, адсутнасць сюжэта, выдуманых герояў, несапраўдных падзей. Фарміраванне тыпалагічнай мадэлі жанру эсэ ў беларускай літаратуры адбывалася адносна самастойна. Павелічэнню аўтарскага самавыяўлення ў тэксце садзейнічала распаўсюджанне ўніяцтва і пратэстантызму ў Беларусі. Найбольш выразна тыпалагічныя рысы, якія ў далейшым сталі характэрнымі жанру эсэ, праявіліся ў творах публіцыстычнай літаратуры эпохі Адраджэння і палемічнай літаратуры эпохі Барока. Айчынная тыпалагічная мадэль тэкстаў-папярэднікаў жанру эсэ ў цэлым ідэнтычная еўрапейскай мадэлі, аднак мае пэўныя асаблівасці: безасабовая дыялагічная форма ў большасці тэкстаў, дамінаванне рэлігійнай тэматыкі. Структурызацыя тэкста, выкарыстанне пачатковага тэзіса (парадокса), разгалінаваная і прадуманая сістэма доказаў, разважлівасць, звароты да чытача, эмацыянальнасць – зместава-фармальныя элементы тэкста, распрацаваныя ў даўняй літаратуры К. Тураўскім, Г. Цамблакам, Ф. Скарынам, С. Будным, Л. Зізаніем, А. Воланам, К. Транквіліёнам-Стаўравецкім. Сукупнасць адзначаных вышэй прымет паўтаралася ў творах беларускай літаратуры ХХ – пачатку ХХІ стагоддзяў і з'яўляецца характэрнай жанру эсэ. Тыпалагічная мадэль жанру эсэ праявілася і ў айчынных тэкстах ХІХ стагоддзя (творы Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, Ф. Багушэвіча, К. Каганца), аднак па прычыне скіраванасці мастакоў слова на даследаванне культуры, гісторыі, этнаграфіі краіны, распаўсюджаным стаў жанр нарыса, які блізкі, але не тоесны эсэ [1; 3; 7; 10; 14; 15; 17].

2. Дыдактызм, эмацыянальнасць, рытарычнасць беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя (творчасць Цёткі, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, Ц. Гартнага, А. Гаруна, В. Ластоўскага) абумовілі дамінаванне прамоў, тэкстаў выступленняў, лістоў. Плённымі для развіцця эсэ сталі 1920-я гады. Эсэ "Адвечным шляхам" І. Абдзіраловіча, "Гэтым пераможаш!.." Сулімы, эсэ А. Бабарэкі і У. Жылкі садзейнічалі значнаму развіццю і ўдасканаленню формы і зместу жанру эсэ. Для першых беларускіх ўзораў жанру было характэрнае спалучэнне рэлігійнага і свецкага пачаткаў, імкненне аўтараў да мастацтвацэнтрызму, актыўная распрацоўка новай

тэматыкі (І. Абдзіраловіч асэнсоўваў праблемы аўтарытэтаў, моды, дысцыпліны, інертнасці, традыцыі, ідэалу). Адметным у працэсе эвалюцыі эсэ стала метафізічнае адлюстраванне аўтарам рэчаіснасці, найбольш выразна праяўленае ў творах А. Бабарэкі. У творчасці У. Жылкі эсэ становіцца дастаткова акрэсленым жанрам, заснаваным на парадоксе. Гістарычнымі абставінамі абумоўлена зніжэнне ролі аўтарскага “я” ў творах пасляваеннага перыяду развіцця літаратуры (эсэ В. Быкава, А. Адамовіча). Паступовае аднаўленне жанру эсэ адбылося ў творчасці Я. Брыля. Роля аўтарскага “я” ў тэкстах узрастала адпаведна з’яўленню чарговага жанру ў творчасці пісьменніка: прамова – слова – успамін – эсэ. У 1950-х гадах упершыню ў беларускай літаратуры з’явіліся эсэ, напісаныя для дзяцей і пра дзяцей. Удасканаленню жанру ў савецкі перыяд садзейнічала эсэістыка У. Краткевіча, які часткова вярнуў у эсэ парадокс, пашырыў тэматыку. Некаторыя эсэ Р. Барадуліна роднасныя па стылі і змесце эсэ І. Абдзірловіча і Сулімы. У 1980-я гады прысутнасць эсэ ў літаратуры фармальная па прычыне нявызначанасці жанравай атрыбуцыі твораў (Н. Гілевіча, А. Карпюка, А. Асташонка, М. Стральцова і інш.) [1; 2; 3; 5; 6; 8; 9; 10; 11; 14; 15; 19; 20; 22].

3. Эсэ – празаічны жанр, у якім выражаецца светапоглядная канцэпцыя аўтара. Эсэ ўласцівыя парадаксальнасць, суб’ектыўнасць, эмацыянальнасць, рэфлексійнасць, адсутнасць дыдактызму, “метафізічная праблематыка”; гэта маналагічны жанр, які не вытрымлівае канкурэнцыі некалькіх канцэпцый, грунтуецца на нацыянальнай аснове і ўбірае ў сябе спецыфіку роднай літаратуры. Ступень праяўлення адзначаных прымет можа вар’іравацца ў залежнасці ад віду эсэ. Нягледзячы на знешнюю свабоду формы, эсэ амаль заўсёды мае лагічную, прадуманую структуру. Большасць эсэ складаецца з парадокса (або філасафемы), аргументаў-доказаў і заключэння, якое паўтарае першапачатковы тэзіс. Беларускія пісьменнікі ў эсэістычных тэкстах асэнсоўваюць сусветную і айчынную гісторыю (І. Абдзіраловіч, У. Жылка, У. Караткевіч, В. Казько, А. Бахарэвіч і інш.), менталітэт нацыі, традыцыі (І. Абдзіраловіч, Р. Барадулін, П. Васючэнка, А. Бацюкоў і інш.), значнасць культурна-гістарычных дзеячаў (Я. Брыль, Н. Гілевіч, Л. Галубовіч, А. Марціновіч, Г. Марчук, А. Сямёнава, І. Саверчанка і інш.), філасофскія метафізічныя пытанні (Суліма, А. Бабарэка, У. Жылка, Л. Рублеўская і інш.). Беларускае эсэ вылучае выразнае дамінаванне праблемы нацыянальнай ідэнтычнасці, якая не характэрная для першых класічных узораў эсэ (“Застольных гутарак” Плутарха, “Запісак каля падушкі” С. Сёнагон, “Вопытаў” М. Мантэня). Праблема народнасці выявілася ў публіцыстычнай літаратуры XIX стагоддзя (Я. Баршчэўскі, Ф. Багушэвіч, К. Каганец) і асэнсоўвалася ў 1920-я гады І. Абдзіраловічам (гаворыць пра ваганне

Беларусі паміж Захадам і Усходам), Сулімам (сцвярджае неабходнасць актыўнага дзеяння народа), У. Жылкам (нацыянальная праблема вырашаецца шляхам усведамлення нацыянальнай гісторыі). Выразнае праяўленне нацыянальнай тэматыкі характэрна для творчасці Р. Барадуліна, які бачыць адраджэнне беларускай нацыі праз гістарычную спадчыну, самабытнасць. Нацыянальная праблематыка характэрная для сучаснай беларускай эсэістыкі (У. Арлоў, Л. Галубовіч, В. Казько, Л. Рублеўская і інш.) [1; 5; 6; 7; 9; 11; 12; 13; 15; 16; 17].

4. Пра імкненне ўстанавіць кантакт з умоўным чытачом сведчаць прыёмы актывізацыі ўвагі, выкарыстаныя ў даўняй літаратуры (непасрэдны зварот да чытача ў “Прытчы” К. Тураўскага, форма дыялогу ў “Катэхізісе” С. Буднага, ужыванне займенніка “мы” ў “Павучанні” Л. Зізанія). Жаданне “пагутарыць” з умоўным чытачом выказвалі пісьменнікі ХІХ – пачатку ХХ стагоддзя. Асаблівасць камунікатыўных ўзаемаадносін паміж аўтарам і чытачом у жанры эсэ выяўляецца ў непасрэднай скіраванасці аўтара на выклiканне рэакцыі ўмоўнага чытача. Аўтар эсэ пры стварэнні тэксту выкарыстоўвае стратэгію ўнушэння. Для эсэ характэрна персуазіўнасць. З дапамогай персуазіўнасці эсэіст стварае неаспрэчную сістэму доказаў і пераконвае рэцыпіента ў правільнасці аўтарскага выказвання. Форма “дыялагізаванага маналогу” (К. Брандэс) сцвярджае роўную значнасць аўтара і чытача эсэ. Прысутнасць аўтара ў сучасным мастацкім эсэ вагаецца ад мінімальнага (інфарматыўныя філасофскія эсэ Л. Рублеўскай) да таго, дзе аўтарскія развагі і эмоцыі займаюць амаль увесь тэкст (апавядальныя лірычныя эсэ Л. Дранько-Майсюка). Эсэіст пераконвае чытача ў правільнасці ўласнага погляду, г. зн. суб’ектыўнае аўтар імкнецца прадставіць як аб’ектыўнае [1; 2; 3; 6; 11; 12; 15; 16; 18].

5. Сучасныя эсэісты, не адмаўляючыся ад усталяваных традыцый (суб’ектыўнасць, парадаксальнасць, аўтарскае самавызначэнне ў тэксце, арыентаванасць на крытычную рэакцыю чытача, дынамічнасць, гуманістычны характар, лагічная і доказная сістэма), выкарыстоўваюць і новыя, раней не вядомыя жанру эсэ адзнакі і мастацкія сродкі (вострая іронія У. Арлова, літаратурны фрэйм у А. Бацюкова, графічныя сродкі ў І. Шаўляковай, інфарматыўнасць у Л. Рублеўскай, А. Бахарэвіча, ампліфікацыя ў А. Андрэева, алагічнасць у Ю. Пацюпы). У працэсе жанравай эвалюцыі ў аргументацыйнай частцы эсэ зменшылася колькасць прыкладаў. Тэматыка ў межах аднаго твора разглядаемага жанру звузілася, а ў пераважнай колькасці эсэ вылучаецца адна тэма. Больш выразным у параўнанні з папярэднімі перыядамі развіцця жанру эсэ стала праяўленне аўтарскага “я” ў тэксце. У форме сучаснага эсэ значных змен не адбылося.

Сучасная эсэістыка прадстаўлена рознымі тэматычнымі відамі: філасофскае, гістарычнае, мастацкае, літаратуразнаўчае эсэ і інш. [4; 7; 8; 9; 12; 16; 19; 21].

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў

Вынікі праведзенага даследавання могуць быць выкарыстаны:

1) у навукова-даследчай дзейнасці, арыентаванай на вывучэнне тэорыі і гісторыі эсэістыкі;

2) у навукова-метадычнай дзейнасці пры стварэнні энцыклапедычных і адукацыйных выданняў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў і падручнікаў, адрасаваных выкладчыкам, студэнтам-філолагам і старшакласнікам, а таксама пры напісанні курсавых і дыпломных прац ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь;

3) у вучэбным працэсе пры распрацоўцы лекцый і практычных заняткаў, спецсемінараў і спецкурсаў, прысвечаных тэорыі і гісторыі развіцця жанру эсэ;

4) у літаратурнай практыцы пры вызначэнні жанру твораў.

Дысертацыйная работа адкрывае перспектывы для далейшага даследавання тэмы. Прыклады аналізу відаў эсэ дапамогуць у будучым пашырыць, верыфіцыраваць і ўдакладніць функцыянальна-тэматычную класіфікацыю эсэ шляхам вылучэння тэматычных дамінант творчасці аўтараў. Далейшае вывучэнне эсэістыкі пашырыць уяўленні пра творчасць асобных аўтараў і сфарміруе больш дакладнае разуменне працэсаў станаўлення, функцыянавання і змянення жанравай сістэмы айчыннай літаратуры. Перспектыўным напрамкам далейшага вывучэння твораў павінна стаць ажыццяўленне паўнавартаснага навуковага выдання анталогіі беларускай эсэістыкі.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Артыкулы ў навуковых выданнях, рэкамендаваных ВАК

1. Бажок, І. Эсэ: паэтыка жанру / І. Бажок // Роднае слова. – № 11. – 2011. – С. 22–24.

2. Бажок, І. Запаветная эсэістыка Янкі Брыля / І. Бажок // Полымя. – № 3. – 2012. – С. 123–127.

3. Бажок, І. Генезіс эсэістычнага жанру на Беларусі / І. Бажок // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. – № 1 (76). – 2013. – С. 79–82.

4. Бажок, І. Беларуская эсэістыка пра каханне / І. Бажок // Актуальні проблеми слов'янської філології. Серія: лінгвістика і літературознавство: міжвуз. зб. наук. ст. / Берд. держ. пед. ун-т. ; гол. ред. В.А. Зарва. – Бердянськ, 2013. – Вип. XXVII. – Ч. 1. – 536 с. – С. 41–46.

5. Бажок, І. Жанрава-тэматычныя адметнасці эсэістычных твораў А. Бабарэкі і А. Разанава / І. Бажок // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. – № 1 (82). – 2014. – С. 42–45.

6. Бажок, І. Жанр эсэ ў творчасці Уладзіміра Караткевіча / І. Бажок //Роднае слова. – № 8. – 2014. – С. 13–15.

7. Бажок, І. Жанрава-тэматычныя асаблівасці беларускай і ўкраінскай эсэістыкі / І. Бажок // Наукові записки Бердянського державного педагогічного університету. – 2014. – Випуск IV. – С. 181–188.

8. Божок, И. Динамика представлений о культуре в белорусской эссеистике / І. Бажок // Мова і культура (Науковий журнал). – Вип. 19. – Т. I (181). – Київ : Видавничий дім Дмитра Бураго, 2016. – С. 369–373.

9. Бажок, І. Філасофскае асэнсаванне рэчаіснасці ў эсэістыцы Людмілы Рублеўскай / І. Бажок // Роднае слова. – № 1. – 2018. – С. 34–37.

**Артыкулы ў навуковых зборніках і часопісах**

10. Бажок, І. Беларуская эсэістыка 20 стагоддзя / І. Бажок // Białorutenistyka Białostocka. – Białystok : Uniwersytet w Białymstoku , 2011. – Т. 3. – С. 177–189.

11. Бажок, І. Нацыянальныя і агульначалавечыя парадоксы ў эсэ У. Жылкі / І. Бажок // Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах : зб. арт. [да 85-годдзя з дня нараджэння І. Навуменкі], Гомель, 7 – 8 кастрычніка 2010 года / ГДУ імя Ф. Скарыны ; рэдкал.: І. Ф. Штэйнер (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2010. – С. 74–77.

12. Бажок, І. Беларуская эсэістыка сёння. Паэтыка літаратурна-крытычнага эсэ / І. Бажок // Христианский гуманизм и его традиции в славянской культуре : сборник научных статей. Вып 4. / М-во образования РБ, Гомельский гос. ун-т им. Ф. Скорины ; редкол.: Т.Н. Усольцева (гл. ред.) [и др.]. – Гомель, 2011. – С. 31–34.

13. Бажок, І. Развіццё эсэістычнага мыслення як неабходны кампанент літаратурнай адукацыі / І. Бажок // Современное образование: преемственность и непрерывность образовательной системы "школа – вуз" : в 2 ч. Ч. 1 / М-во образованния Респ. Беларусь, Гомельский гос. ун-т им. Ф. Скорины ; редкол.: И. В. Семченко (гл. ред.), С. А. Хахомов (гл. ред.) [и др.]. – Гомель, 2011. – С. 133–135.

14. Бажок, І. Заканамернасць узнікнення жанру эсэ / І. Бажок // Спадчына І. Я. Навуменкі і актуальныя праблемы літаратуразнаўства. Зборнік навуковых артыкулаў / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэдкал.: І. Ф. Штэйнер (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2016. – С. 29–33.

15. Божок, И. Эссе: (не)свободный жанр / І. Бажок // Нёман. – № 7. – 2017. – С. 164–174.

16. Бажок, І. Тэхніка стварэння эсэістычнага тэксту / І. Бажок // Спадчына Скарыны: да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання : зб. навуковых артыкулаў : у 2 ч. ч. 1 / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэдкал. : А. М. Ермакова (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2017. – С. 65–68 .

17. Бажок, І. Эсэ ў сістэме жанраў / І. Бажок // Христианский гуманизм и его традициивславянскойкультуре:сборникнаучныхстатей.Вып 11 /М-вообразования Респ. Беларусь, Гомельскийгос. ун-т им. Ф. Скорины ; редкол.: Н.В. Суслова (гл. ред.) [и др.]. – Гомель, 2017. – С. 12–16.

18. Бажок, І. Практычнае выкарыстанне эсэ спецыялістамі розных сфер дзейнасці / І. Бажок // Актуальные вопросы научно-методической и учебно-организационной работы : сборник научных статей / М-во образованния Респ. Беларусь, Гомельский гос. ун-т им. Ф. Скорины ; редкол.: И. В. Семченко (гл. ред.), С. А. Хахомов (гл. ред.) [и др.]. – Гомель, 2018. – С. 139–142.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

19. Бажок, І. Гісторыка-культурныя рэаліі ў эсэістыцы Віктара Казько / І. Бажок // Чацвёрты Міжнародны Кангрэс даследчыкаў Беларусі : працоўныя матэрыялы. Т. 3 (2014). – Kaunas, Lithuania: Vytautas Magnus University Press, 2014. – С. 464–468.

20. Бажок, І. Эвалюцыя адлюстравання культурнага жыцця нацыі ў беларускай эсэістыцы / І. Бажок // Сохранение национальной идентичности белорусского общества: прошлое, настоящее, перспективы : материалы республиканской научной конференции 21 апреля 2016 г., г. Барановичи, Респ. Беларусь / Баран. гос. ун-т. ; редкол.: А. В. Никишова (гл. ред.) [и др.]. – Барановичи, 2016. – С. 128–132.

21. Бажок, І. Эсэ як сродак папулярызацыі сучаснай беларускай літаратуры / І. Бажок // Першы міжнародны навуковы кангрэс беларускай культуры : зборнік матэрыялаў (Мінск, Беларусь, 5 – 6 мая 2016 г.) / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ; рэдкал.: А. І. Лакотка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Права і эканоміка, 2016. – С. 785.

22. Бажок, І. Парадоксы беларускай эсэістыкі / І. Бажок // Тенденции и перспективы развития науки и образования в условиях глобализации : Материалы XXVI Международной научно-практической интернет-конференции, Переяслав-Хмельницкий, Украина, 28 июня 2017 г. / Переяслав-Хмельницкий гос. пед. ун-т им. Г. Сковороды ; редкол.: В. П. Коцур (гл. ред.) [и др.]. – Переяслав-Хмельницкий, 2017. – Вып. 26. – С. 141–143.

# РЭЗЮМЭ

## Бажок Ірына Аляксандраўна

## Эсэ ў беларускай літаратуры: эвалюцыя, сучасныя тэндэнцыі развіцця

**Ключавыя словы:** жанр, эсэ, беларуская літаратура, парадокс, доказная сістэма, аўтарская стратэгія, суб'ектыўнасць, я-канцэпцыя.

**Мэтай даследавання** з'яўляецца вызначэнне жанравых асаблівасцей, шляхоў фарміравання і спецыфікі функцыянавання беларускага эсэ ў працэсе літаратурнай эвалюцыі.

**Метады даследавання**. Метадалогія даследавання носіць комплексны характар. Пры правядзенні даследавання выкарыстаны аналітычны, сістэмны,культурна-гістарычны, параўнальна-тыпалагічны метады, метад цэласнага аналізу тэксту літаратурнага твора.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** У дадзеным даследаванні ўпершыню ў айчынным літаратуразнаўстве праведзены комплексны літаратуразнаўчы аналіз беларускіх эсэ, а таксама эсэістычных твораў, жанрава блізкіх да эсэ. Вызначана тыпалагічная мадэль жанру эсэ ў беларускай літаратуры; выяўлена спецыфіка гістарычнага развіцця жанру эсэ ў айчыннай літаратуры XX стагоддзя, ахарактарызаваны змест і мастацкая спецыфіка эсэ, выяўлены асаблівасці камунікатыўных узаемаадносін паміж аўтарам і чытачом ў эсэістычных творах, вызначаны адметнасці ідэйна-тэматычнага дыяпазону і кампазіцыйнай арганізацыі сучаснага беларускага эсэ, асноўныя тэндэнцыі развіцця эсэ ў сучаснай беларускай літаратуры.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні атрыманых вынікаў.** Вынікі праведзенага даследавання могуць быць выкарыстаны пры вывучэнні тэорыі і гісторыі эсэ, пры стварэнні энцыклапедычных і адукацыйных выданняў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў і падручнікаў.

**Сфера прымянення.** Літаратуразнаўства (гісторыя літаратуры, тэорыя літаратуры).

# РЕЗЮМЕ

**Божок Ирина Александровна**

**Эссе в белорусской литературе: эволюция, современные тенденции развития**

**Ключевые слова:** жанр, эссе, белорусская литература, парадокс, система доказательств, авторская стратегия, субъективность, я-концепция.

**Целью исследования** является определение жанровых особенностей, путей формирования и специфики функционирования белорусского эссе в процессе литературной эволюции.

**Методы исследования.** Методология исследования носит комплексный характер. При проведении исследования использованы аналитический, системный, культурно-исторический, сравнительно-типологический методы, метод целостного анализа текста литературного произведения.

**Полученные результаты и их новизна.** В данном исследовании впервые в отечественном литературоведении проведен комплексный литературоведческая анализ белорусских эссе, а также эссеистических произведений, жанрово близких к эссе. Определена типологическая модель жанра эссе в белорусской литературе; выявлена специфика исторического развития жанра эссе в отечественной литературе XX века, охарактеризованы содержание и художественная специфика эссе, выявлены особенности коммуникативных взаимоотношений между автором и читателем в эссеистических произведениях, определены особенности идейно-тематического диапазона и композиционной организации современного белорусского эссе, основные тенденции развития эссе в современной белорусской литературе.

**Рекомендации по использованию полученных результатов.** Результаты проведенного исследования могут быть использованы при изучении теории и истории эссе, при создании энциклопедических и образовательных изданий, учебно-методических пособий и учебников.

**Сфера применения.** Литературоведение (история литературы, теория литературы).

## SUMMARY

**Iryna Bazhok**

**Essay in Belarusian literature: evolution, modern development trends**

**Keywords:** genre, essay, Belarusian literature, paradox, evidential system, author's strategy, subjectivity, self-concept.

**The aim of the research** is to determine the genre features, ways of formation and specific functioning of the Belarusian essay in the process of literary evolution.

**Methods of the research.** The research methodology is complex. To solve the problems of the research the analytical method, systemmethod, cultural and historical method, comparative and typological method, the method of integral analysis of a literary work have been used.

**The results obtained and their novelty.** In this paper, for the first time in the domestic literature Belarusian essay and also asessing works close to the genre of essay have been analyzed. The typological model of the essay genre in the Belarusian literature has been defined; the specificity of historical development of the genre of essay in literature of XXth century has been found, the contents and the artistic specificity of the essay have been described, the peculiarities of the communicative relationship between author and reader in asessing works have been found, especially the ideological and topical range and the composition of the modern Belarusian essays, major trends in the development of essay in the modern Belarusian literature have been defined.

**The practical value of the research.** The materials and research results of the thesis can be used in studying theory and history of essay, when creating encyclopedic and educational publications, teaching manual and textbooks.

**Sphere of application.** Literature (history of literature, theory of literature).